Источник: "Літаратура і мастацтва" - 2012-11-09

# Слова краязнаўцы



**Мікалай ТАЛЮК, старшы навуковы супрацоўнік Ваўкавыскага ваенна-гістарычнага музея, распавядае пра гісторыю ўтварэння ўстановы:**

— Сваім узнікненнем наш музей абавязаны Георгію Пеху, краязнаўцу-энтузіясту, які ў 1925 — 1935 гадах апантана збіраў прадметы даўніны, удзельнічаў у археалагічных раскопках старажытнага гарадзішча. У 1935-м на грамадскіх пачатках у горадзе быў адкрыты краязнаўчы музей, а калекцыя Георгія Мікалаевіча стала асновай яго экспазіцыі. З уваходжаннем Заходняй Беларусі ў склад БССР ён быў нацыяналізаваны і зноў адкрыты для наведвальнікаў 1 студзеня 1940 года. Падчас вайны музей быў разрабаваны і зачынены.

У красавіку 1946-га Ваўкавыскі райвыканкам прыняў рашэнне па рэарганізацыі раённага краязнаўчага музея. Пех вярнуўся ў горад і заняўся зборам новай калекцыі. Дзякуючы падтрымцы грамадства і дзяржавы, Акадэміі навук БССР і асабіста Якуба Коласа, музеяў Савецкага Саюза, а таксама раскопкам, праведзеным Георгіем Пехам на месцы старажытнага Ваўкавыска, фонды значна папоўніліся, і 1 верасня 1948 года адроджаны музей адкрылі афіцыйна. У наступныя гады былі зроблены крокі па змене яго профілю, і ў хуткім часе ўстанова атрымала прапіску ў старадаўнім будынку памешчыцкай сядзібы, дзе ў 1812 годзе размяшчаўся штаб Другой Заходняй арміі генерала Пятра Баграціёна. У 1950 годзе ля ўвахода ўсталявалі бронзавы бюст выдатнага палкаводца (работа скульптара Заіра Азгура). Праз нейкі час паступілі экспанаты з расфарміраванага Ленінградскага артылерыйскага гістарычнага музея — зброя і рыштунак еўрапейскіх армій XVIII — XIX стст.

27 лютага 1953 года ваўкавыскі музей быў ператвораны ў Ваенна-гістарычны музей імя П. І. Баграціёна. Георгій Пех кіраваў ім да 1967 года. Экспазіцыя расла — спатрэбіліся дадатковыя выставачныя плошчы. У 1989-м пачалі ўзводзіць новы будынак, які адчыніў дзверы адзінаццаць год таму. Цяпер тут размешчаны экспазіцыі, прысвечаныя гісторыі Ваўкавыска ад сярэднявечча да сённяшніх дзён, і выставачная зала. У фае наведвальнікі знаёмяцца з гісторыяй музея. У старым будынку размешчана экспазіцыя, прысвечаная найважнейшым падзеям у жыцці П. Баграціёна, яго паплечнікаў. Шэраг экспанатаў распавядае пра гісторыю Ваўкавыска падчас вайны 1812 года.

Мікалай Талюк. Слова краязнаўцы